Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
______________Ю. П. Бондар
«____»_____________2012 г.
Рэгістрацыйны № ВД-__ /вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-02*
*Культуралогія (прыкладная)*

Мінск 2012

**Складальнік**

*А. І. Сцепанцоў,* загадчык кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*У. Ф. Мартынаў,* загадчык кафедры культуралогіі прыватнай установы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава», доктар культуралогіі, прафесар;

*А. І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

кафедрай менеджменту сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 12 ад 29.06.2011 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 29.11.2011 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*

Адказны за выпуск *А. І. Сцепанцоў*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

«Уводзіны ў спецыяльнасць» – вучэбная дысцыпліна для студэнтаў, якія атрымоўваюць кваліфікацыю «культуролаг-менеджар». Дысцыпліна «Уводзіны ў спецыяльнасць» распачынае цыкл спецыяльных дысцыплін і дае зыходныя тэарэтычныя звесткі па асновах кіравання з улікам прыярытэтаў сферы культуры.

Уключэнне культуралогіі ў сістэму вучэбных дысцыплін з'яўляецца неабходным элементам універсітэцкай адукацыі і следствам прызнання таго, што імкненне стаць кампетэнтным спецыялістам немагчыма без разумення заканамернасцей культурных працэсаў і, асабліва, без ясных уяўленняў культурных перспектыў чалавецтва. Мэта навуковага вывучэння культуры – у спасціжэнні творчых здольнасцей чалавека, у спазнанні прыроды яго індывідуальнасці, асаблівасцей асобаснай свядомасці і свядомасці розных грамадскіх груп. Культуралогія як навучальная дысцыпліна здольная даць студэнту не толькі шырыню навуковага далягляду, але і магчымасць асэнсавання ўласнага месца ў жыцці як спецыяліста і грамадзяніна. Прыкладная культуралогія непасрэдна займаецца апісаннем і асэнсаваннем культурнай канкрэтыкі, у адрозненне ад тэарэтычнай культуралогіі знаходзіцца ў сферы адзінкавага, а не ўсеагульнага, выкарыстоўваючы агульнатэарэтычныя высновы і абагульненні для тлумачэння пэўных культурных з'яў, што мяркуе і выпрацоўку адпаведнай практыкі.

*Мэта* дысцыпліны – сфарміраваць у студэнтаў прафесійныя арыентацыі ў сферы прыкладной культуралогіі, даць пэўны кірунак засваення вучэбных курсаў у адпаведнасці з зацверджанымі стандартамі навучання, а таксама скіраваць на арганізацыю самастойнай работы па пошуку, адборы і асэнсаванні прафесійнай інфармацыі.

*Задачы* дысцыпліны:

– даць асноўныя звесткі аб універсітэце; азнаёміць з існуючымі ўзроўнямі адукацыі і патрабаваннямі да атэстацыі;

– сфарміраваць зыходныя ўяўленні аб кваліфікацыі «культуролаг-менеджар», увесці ў спецыфіку будучай спецыяльнасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вызначыць кірункі авалодання студэнтамі прафесійнай кампетэнцыяй, азнаёміць са стандартамі навучання па напрамку спецыяльнасці «культуралогія (прыкладная)»;

– увесці ў асновы паняційна-катэгарыяльнага, тэрміналагічнага апарату прыкладной культуралогіі;

– выпрацаваць у студэнтаў элементарныя ўменні па апрацоўцы атрыманай інфармацыі, рабоце з літаратурай і сеткай Інтэрнэта;

– далучыць да рацыянальнай арганізацыі сваёй вучэбнай працы і штодзённага яе планавання.

*Змест* дысцыпліны раскрывае аб’ект, прадмет і метады прыкладной культуралогіі, паказвае сацыяльна-культурную дзейнасць як сферу практыкі, вызначае галіну культуры як частку сацыякультурнай прасторы і аб’ект кіравання, характарызуе маніторынг культурных патрэбнасцей індывідаў і грамадства як крыніцу прагназавання, скіроўвае першакурснікаў на рацыянальную арганізацыю сваёй вучэбнай працы.

*Засваенне дысцыпліны забяспечвае студэнтаў зыходнымі ведамі аб:*

– арганізацыйнай структуры, правілах унутранага распарадку ўніверсітэта, асноўных традыцыях і змесце найболей важных элементаў карпаратыўнай культуры ўніверсітэта;

– прыкладной культуралогіі, якая раскрывае сродкі, метады і формы далучэння чалавека да свету культуры, вызначае механізм стварэння спрыяльнага культурнага асяроддзя, абгрунтоўвае тэхналогію забеспячэння ўмоў для рэалізацыі духоўна-эўрыстычных, інтэлектуальных, мастацка-творчых патэнцый людзей, праяўлення іх сацыяльна-культурнай актыўнасці;

– маніторынгу сацыяльных дэтэрмінацый у развіцці культурных аб’ектаў;

– адукацыйным стандарце па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках), кваліфікацыі «культуролаг-менеджар»;

– структуры вучэбнага плана спецыяльнасці, прыёмах і метадах, якія забяспечваюць павышэнне эфектыўнасці выкарыстання вучэбнага часу, асновах арганізацыі навучальнага працэсу;

– правах і абавязках студэнта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дысцыпліна накіравана на выпрацоўку ў студэнтаў першапачатковых уменняў:*

– рацыянальнай арганізацыі сваёй вучэбнай працы і штодзённага яе планавання;

– эфектыўнага выкарыстання дадзенай універсітэтам інфармацыі;

– фарміравання адпаведных адносін з іншымі студэнтамі, выкладчыкамі і ўніверсітэтам;

– элементарнай апрацоўкі атрыманай інфармацыі з навукова-метадычнай літаратуры і сеткі Інтэрнэта;

– індывідуальнага ўсведамлення тэарэтычнага матэрыялу і сувязі яго з культурнай практыкай, развіцця логікі вуснага і пісьмовага пераказу;

– выкарыстоўвання базавай тэрміналогіі прыкладной культуралогіі;

– збору маніторынгавай інфармацыі (інтэрв’ю, анкетавання, тэсціравання), аналізу праблем і фактараў, якія іх выклікаюць, ранжыравання альтэрнатыў.

Пры выкладанні дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць» мяркуецца выкарыстоўваць тлумачальна-ілюстрацыйны, даследчы, праблемны метады навучання.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на развіццё творчых навыкаў пошуку неабходнай інфармацыі з навукова-метадычнай літаратуры, газетных публікацый, радыё- і тэлеінфармацыі, інтэрнэт-крыніц. Выкарыстоўваецца кантэнт-аналіз крыніц, прысвечаных актуальным праблемам прыкладной культуралогіі, прадпрымальніцкай дзейнасці ў сферы культуры, на падставе якога кожны студэнт піша рэферат.

У адпаведнасці з вучэбным планам на выкладанне дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць» усяго прадугледжана 44 гадзіны, з якіх 30 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 20 гадзін, семінары – 10 гадзін.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практычныя |
| *Уводзіны* | 2 | 2 | |
| *Тэма* 1. Асноўныя звесткі аб універсітэце, адукацыйным працэсе і атэстацыі студэнтаў | 2 | 2 | |
| *Тэма* 2. Мадэль спецыяліста сацыякультурнай сферы | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма* 3. Культура. Адукацыя | 2 | 2 | |
| *Тэма* 4. Культуралогія ў сістэме навук аб чалавечай жыццядзейнасці | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма* 5. Галіна культуры як частка сацыякультурнай прасторы і аб’ект кіравання | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Маніторынг культурных патрэбнасцей індывідаў і грамадства як крыніца прагназавання ў сферы культуры | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма* 7. Самаменеджмент як аснова павышэння прафесійнага ўзроўню | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма* 8. Самастойная работа студэнта. Пошук, адбор інфармацыі і работа з тэкстамі | 2 | 2 | |
| **Разам…** | **30** | **20** | **10** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Мэта і задачы курса, прадмет, структура, змест. Веды і ўменні, якія выпрацоўваюцца ў працэсе вывучэння курса. Сувязь курса з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Характарыстыка асноўных крыніц вучэбнай, навуковай, метадычнай літаратуры і электронных рэсурсаў.

Фарміраванне зыходных уяўленняў аб кваліфікацыі «культуролаг-менеджар». Міждысцыплінарны характар культуралагічнага сегмента, які аб'ядноўвае гуманітарныя веды, уключае сферу духоўнага жыцця (мастацтва, рэлігію, мову, навукі, мараль) і штодзённую дзейнасць людзей (этнічныя і рэлігійныя традыцыі, масавую культуру, моду, сродкі камунікацыі і інтэлектуальных зносін). Менеджмент як спецыфічная дзейнасць прафесіянала, скіраваная на кіраванне вытворчымі паводзінамі людзей і знешнімі сувязямі арганізацыі ў сацыяльна-эканамічным асяроддзі.

## Тэма 1. Асноўныя звесткі аб універсітэце, адукацыйным працэсе і атэстацыі студэнтаў

Місія Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў: падрыхтоўка высокакласных спецыялістаў, выхаванне інтэлектуальнай і мастацкай эліты грамадства на аснове інтэграцыі ў міжнародную адукацыйную прастору шляхам распаўсюджвання і сцвярджэння гуманістычных ідэалаў сусветнай культуры, захавання і прымнажэння традыцый нацыянальнай культурнай спадчыны.

Гісторыя: стварэнне Мінскага інстытута культуры 1 верасня 1975 года ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў БССР на базе бібліятэчнага факультэта Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага і аддзялення культурна-асветніцкай работы Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута; развіццё і пераўтварэнне ва ўніверсітэт, адкрыццё аспірантуры і магістратуры.

Сучасны стан універсітэта: асноўныя характарыстыкі арганізацыйнай структуры; рэктарат і іншыя элементы апарату кіравання; падраздзяленні непасрэднага ўзаемадзеяння са



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнтам падчас навучальнага працэсу (дэканат, кафедра, куратар групы, выкладчыкі); інфармацыйныя падраздзяленні і службы.

Правілы ўнутранага распарадку ўніверсітэта; асноўныя традыцыі і змест найболей важных элементаў карпаратыўнай культуры ўніверсітэта.

Структура вучэбнага плана спецыяльнасці і спецыялізацый. Асноўныя спосабы атэстацыі студэнта. Патрабаванні да студэнтаў пры здачы залікаў і экзаменаў. Пераздача залікаў і экзаменаў. Дзяржаўныя экзамены.

Правы́ і абавязкі студэнта.

## Тэма 2. Мадэль спецыяліста сацыякультурнай сферы

Мадэль спецыяліста як вобраз адукацыйнай рэальнасці, прыклад, стандарт, які дае характарыстыкі і функцыянальныя паказчыкі аб’екта-арыгінала. Адукацыйны стандарт па спецыяльнасці 1-21 04 01-02 Культуралогія (прыкладна́я), кваліфікацыя «культуролаг-менеджар». Агульныя мэты падрыхтоўкі спецыяліста: фарміраванне і развіццё сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці, якая дазваляе спалучаць акадэмічную, прафесійную, сацыяльна-асобасную кампетэнцыю для рашэння задач у сферы прафесійнай і сацыяльнай дзейнасці; фарміраванне прафесійнай кампетэнцыі для работы ў галінах культуры, мастацтва, адукацыі. Напрамкі прафесійнай дзейнасці: арганізацыйна-кіруючы; навукова-даследчы; інавацыйна-метадычны; камерцыйны, фінансава-гаспадарчы; маркетынгавы і рэкламна-інфармацыйны.

Задачы навучання: авалодаць лінгвістычнымі навыкамі (вуснай і пісьмовай камунікацыяй); бесперапынна папаўняць свае веды, аналізаваць гістарычныя і сучасныя праблемы эканамічнага і сацыяльнага жыцця грамадства; на навуковай аснове арганізоўваць сваю працу, валодаць камп’ютарнымі метадамі збору, захавання і апрацоўкі інфармацыі ў сферы прафесійнай дзейнасці.

Міжнародны вопыт стандартызацыі адукацыі. Дактрына «ключавой кампетэнцыі» (сацыяльна-грамадзянская, полікультурная, камунікатыўная, інфармацыйная, самаадукацыйная – здольнасць вучыцца на працягу ўсяго жыцця). Сусвет-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ная дэкларацыя аб вышэйшай адукацыі для XXI стагоддзя. Балонскі працэс.

## Тэма 3. Культура. Адукацыя

Існаванне мноства падыходаў да разумення паняцця «культура». Культура як свет знакаў, сфера духоўнай вытворчасці, сістэмная сукупнасць духоўных, мастацкіх і матэрыяльных каштоўнасцей, як творчасць і асобая сфера дзейнасці. Антрапалагічная трактоўка культуры. Станаўленне культуры як біялагічна неспадчыннай інфармацыі ў працэсе назапашвання сацыяльнага досведу калектыўнай жыццядзейнасці людзей. Функцыі культуры: чалавекастваральная (гуманістычная), перадачы сацыяльнага вопыту, камунікатыўная, інфармацыйная, знакава-сімвалічная (семіятычная), каштоўнасная, індывідуалізуючая, інтэгратыўная.

Адукацыя – працэс трансляцыі культуры і рэалізацыі культурных норм у зменлівых гістарычных сітуацыях. Адукацыя як інструмент фарміравання карціны свету чалавека. Функцыі адукацыі: сацыяльна-культурныя, сацыяльна-эканамічныя, сацыяльна-палітычныя. Функцыянальная граматнасць як вынік адукацыі і мера гуманітарнага развіцця нацыі, групы людзей, чалавека. Фарміраванне культурнай кампетэнтнасці як умоўна дастатковая ступень сацыялізаванасці і інкультураванасці індывіда ў грамадстве. Адукацыйная сістэма ў галіне культуры з устойлівымі звёнамі: школьным, прафесійным, паслядыпломным.

Вышэйшая адукацыя як новая якасць набыцця ведаў і імкненне да самаадукацыі.

## Тэма 4. Культуралогія ў сістэме навук аб чалавечай жыццядзейнасці

Падраздзяленне сістэмы навуковых ведаў на тры асноўныя групы: прыродазнаўчыя, тэхнічныя і сацыяльна-гуманітарныя навукі. Культуралогія – навука аб культуры, якая займаецца сістэмным даследаваннем культуры і мэтанакіравана на разуменне ўсеагульных заканамернасцей функцыянавання культуратворчасці, генезісу з’яў сусветнай і айчыннай культуры. Выкарыстанне даных антрапалогіі, сацыялогіі, псіхало-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гіі, гісторыі навукі і тэхнікі і г. д. Тэорыя культуры (асновы тэорыі, галоўныя школы і канцэпцыі, праблемы культурнай і псіхалагічнай антрапалогіі, розныя культуры і культурныя адзінкі, агульныя прынцыпы знакавай сістэмы). Гісторыя культуры (асноўныя тыпы старажытных культур, гісторыя еўрапейскай культуры, гісторыя беларускай культуры).

Прыкладна́я культуралогія – вобласць культуралогіі, якая раскрывае сродкі, метады і формы прыцягнення чалавека ў свет культуры, вызначае механізм стварэння спрыяльнага культурнага асяроддзя, абгрунтоўвае тэхналогію забеспячэння ўмоў для рэалізацыі духоўна-эўрыстычных, інтэлектуальных, мастацка-творчых патэнцый людзей, праяўлення іх сацыяльна-культурнай актыўнасці. Кірункі: агульная тэорыя культурнай палітыкі, тэорыя і методыка дзейнасці культурных інстытутаў, традыцыйная народная і масавая культура, тэорыя і методыка пазаінстытуцыянальных узаемадзеянняў (групавых і індывідуальных міжасобасных).

Сацыяльна-культурная дзейнасць як грамадска абумоўленая маральна-інтэлектуальнымі матывамі мэтазгодная практыка стварэння, засваення, захавання, распаўсюджання каштоўнасцей культуры.

## Тэма 5. Галіна культуры як частка сацыякультурнай прасторы і аб'ект кіравання

Сацыякультурная прастора – асяроддзе стварэння, назапашвання, зберажэння і развіцця сацыякультурных адносін, ведаў, уменняў, каштоўнасцей, норм, форм зносін, інфраструктура сацыяльных, культурных аб'ектаў.

Сфера культуры як вытворца і захавальнік культурных каштоўнасцей, важны сектар эканомікі, які забяспечвае занятасць насельніцтва, прыток даходаў ад турызму і падатковых плацяжоў у дзяржаўны бюджэт. Галіна культуры – частка эканомікі краіны, прастора сацыякультурнай практыкі, сукупнасць арганізацый і ўстаноў, якія забяспечваюць функцыянаванне культуры (народнай і прафесійнай) і далучэнне насельніцтва да культурных каштоўнасцей. Тыпалогія арганізацый культуры.

Дзяржава як галоўны гарант рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян на ўдзел у культурным жыцці і карыстанне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўстановамі культуры, роўнага доступу да каштоўнасцей культуры, інфармацыйных рэсурсаў, стварэння базавых умоў для доступу да культурных даброт.

Органы дзяржаўнага рэгулявання і кіравання ў галіне культуры ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь». Структура кіраўнічых органаў культуры ў Рэспубліцы Беларусь згодна з адміністратыўна-тэрытарыяльным падзелам. Узроўні кіравання, самаарганізацыя і самакіраванне.

## Тэма 6. Маніторынг культурных патрэбнасцей індывідаў і грамадства як крыніца прагназавання ў сферы культуры

Істотнае ўзрастанне ва ўмовах усеагульнай глабалізацыі ўплыву знешніх фактараў на выніковасць дзейнасці любой арганізацыі (стан навакольнага асяроддзя, яе эканамічных, палітычных, сацыяльных, тэхналагічных і інш. складнікаў). Актуальнасць развіцця новых гаспадарчых адносін у галіне культуры ва ўмовах рынку. Неабходнасць стварэння інфармацыйнай базы даных аб рэальным удзеле розных сацыяльных груп (сегментаў) у культурным працэсе, аб іх культурных інтарэсах і патрэбнасцях.

Патрэбнасці як галоўны стымул актыўнасці чалавека. Інтарэс як апрадмечанае, канкрэтызаванае запатрабаванне. Культурныя патрэбнасці (пазнавальныя, маральныя, эстэтычныя, камунікатыўныя).

Сацыяльная дыягностыка – метадалагічны інструмент распрацоўкі сацыяльных прагнозаў і праектаў, вывучэння грамадскай думкі. Маніторынг – комплексны метад пазнавальнага і прадметна-практычнага назірання за станам аб’ектаў сацыяльнага асяроддзя з мэтай яго ацэнкі, аналізу і кантролю. Метады збору інфармацыі: палявыя, натурныя даследаванні (інтэрв’ю і апытанні, рэгістрацыя, назіранне, эксперымент, панэль); збор «другаснага» матэрыялу са спецыяльнай літаратуры, апісанне і атрыбуцыя аб’ектаў. Сістэматызацыя інфармацыі: кантэнт-аналіз, фармальна-стылявы, кампаратыўны, статыстычны, фактарны, структурны аналіз, дынамічнае ма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэляванне, рэдуцыраванне і вывучэнне па аналогіі, экспертная ацэнка.

Маніторынг у арганізацыях культуры – жывая сувязь з суб’ектамі сацыякультурнай дзейнасці і аснова для стварэння запатрабаваных культурных праектаў.

## Тэма 7. Самаменеджмент як аснова павышэння прафесійнага ўзроўню

Неабходнасць праектавання ўласных жыццёвых і вучэбных сітуацый. Праблема самавызначэння і выбару жыццёвых стратэгій. Стратэгія жыцця як абгрунтаванне і рэалізацыя сваёй асобы праз суаднясенне жыццёвых патрабаванняў з асобаснай актыўнасцю, яе каштоўнасцямі і спосабам самасцвярджэння.

Кіраванне сабой: мадэль арганізацыі (я – ідэолаг, я – палітык, я – кіраўнік, я – выканаўца). Узаемадзеянне паміж сутнасцямі ў розных сітуацыях і ацэнка ўзгодненасці дзеянняў. Ацэнка сваёй «самаарганізацыі»: моцныя і слабыя бакі; магчымасці, перашкоды і пагрозы для ўласнага развіцця. Неабходнасць змяненняў у каштоўнасцях жыцця і дзейнасці, у мэтах і сродках кіравання, у метадах рашэння жыццёвых і вучэбных задач. Распрацоўка праграмы рэалізацыі ўласных змен і метадаў самакіравання.

Знешняе асяроддзе як прастора для самаразвіцця культуролага-менеджара. Аналіз сітуацыі знешняга кіравання, яго сродкаў і вынікаў. Прымусовыя метады кіравання, гуманістычныя метады кіравання. Супрацоўніцтва з іншымі выканаўцамі. Работа ў групе як перадумова для будучай паспяховай прафесійнай дзейнасці.

## Тэма 8. Самастойная работа студэнта. Пошук, адбор інфармацыі і работа з тэкстамі

Сістэматычная самастойная работа (самаадукацыя) як від бесперапыннай адукацыі, вольны працэс набыцця ведаў з мэтай павышэння прафесійнага ўзроўню, пашырэння інфармацыйнага творчага поля дзейнасці, падтрымка і ўзбагачэнне «культурнай кампетэнтнасці». Узроўні самастойнай дзейна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сці студэнта: рэпрадукцыйны, рэканструкцыйны, творчы, пошукавы.

Работа з друкаванымі выданнямі і электроннымі дакументамі. Інтэрнэт як крыніца інфармацыі. Жанры навуковай прозы. Стыль навуковых работ, сінтаксічныя асаблівасці і падстылі. Структура, методыка напісання і правіла афармлення пісьмовай работы. Цытаты і спасылкі, абзац як структурная адзінка тэксту. Выкарыстанне невербальных сродкаў (табліцы, графікі, схемы). Моўныя сродкі навуковага стылю (насычанасць тэрмінамі, лагічная паслядоўнасць выкладу, спарадкаваная сістэма сувязі паміж часткамі выказвання, рух думкі ад асобнага да агульнага ці ад агульнага да асобнага, дакладнасць, сціснутасць, адназначнасць пры захаванні насычанасці зместу).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

### *Асноўная*


*Канстытуцыя* Рэспублікі Беларусь. Афіцыйнае выданне. – Мінск: Беларусь, 2009. – 95 с.

*Аб культуры* ў Рэспубліцы Беларусь: закон Рэсп. Беларусь [Новая рэд.] // Нац. реестр правовых актов Республики Беларусь, 2004. – № 87. – С. 7–22.

*Адаир, Д.* Каким вы должны быть или стать / Д. Адаир // Искусство управлять людьми и самим собой / Д. Адаир. – М.: Эксмо, 2006. – С. 27–35.

*Альтшуллер, Г. С.* На пути к себе / Г. С. Альтшуллер, И. М. Верткин // Как стать гением. Жизненная стратегия творческой личности / Г. С. Альтшуллер, И. М. Верткин. – Минск: Беларусь, 1994. – С. 38–44.

*Ариарский, М. А.* Паспорт специальности «Прикладная культурология» / М. А. Ариарский // Прикладная культурология / М. А. Ариарский. – СПб.: Изд-во «ЭГО», 2001. – С. 281–285.

*Арт-менеджмент* как вид управленческой деятельности: сб. ст. / под. ред. С. Б. Мойсейчук, А. И. Степанцова. – Минск: Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2011. – 156 с.

*Гримак, Л. П.* Анатомия самосознания / Л. П. Гримак // Общение с собой: Начала психологии активности / Л. П. Гримак. – КД Либроком, 2009. – С. 63–103.

*Грыгаровіч, Я. Д.* Сутнасць паняцця культуры / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік // Прыкладная культуралогія: вучэб. дапам. / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2005. – С. 26–29.

*Грыгаровіч, Я. Д.* Культуралагічная адукацыя як аснова фарміравання спецыяліста сацыяльна-культурнай сферы / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік // Прыкладная культуралогія: вучэб. дапам. / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2005. – С. 201–219.

*Ерасов, Б. С.* Образование и культура / Б. С. Ерасов // Социальная культурология: учебник для студентов высших учебных заведений. – М.: Аспект Пресс, 2000. – С. 324–326.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Ерасов, Б. С.* Социализирующая функция культуры / Б. С. Ерасов // Социальная культурология: учебник для студентов высших учебных заведений. – М.: Аспект Пресс, 2000. – С. 223–230.

*Королев, Н. Н.* Профессиональная компетентность арт-менеджера / Н. Н. Королев // Арт-менеджмент как вид управленческой деятельности: сб.ст. / под. ред. С. Б. Мойсейчук, А. И. Степанцова. – Минск: Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2011. – С. 47–56.

*Мартынов, В. Ф.* Культурология в контексте современной социокультурной ситуации / В. Ф. Мартынов // Культурология. Теория культуры: учеб. пособие / В. Ф. Мартынов. – Минск: АСАР, 2008. – С. 6–61.

*Смолік, А. І.* Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А. І. Смолік, Л. К. Кухто. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – С. 7–42.

*Смолік, А. І.* Культуралогія: гісторыя культуры: вучэб. дапам. / А. І. Смолік, Л. К. Кухто, А. А. Цобкала. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – С. 6–13.

*Михеева, Н. А.* Отрасль культуры в составе социально-культурной сферы: сущность, структура и особенности управления / Н. А. Михеева, Л. Н. Галенская // Менеджмент в социально-культурной сфере / Н. А. Михеева, Л. Н. Галенская. – СПб.: Изд-во Михайлова В.А., 2000. – С. 25–40.

*Дадатковая*

*Аванесова, Г. А.* Культурно-досуговая деятельность: Теория и практика организации / Г. А. Аванесова. – М.: Аспект Пресс, 2006. – 236 с.

*Белолипецкий, В. К.* Этика и культура управления: учеб.-практ. пособие / В. К. Белолипецкий, Л. Г. Павлова. – М.: ИКЦ «МарТ»; Ростов н/Д: Изд. центр «МарТ», 2004. – 384 с.

*Кириллова, Н. Б.* Менеджмент культуры: учеб. пособие / Н. Б. Кириллова. – Екатеринбург: Изд-во Уральского ун-та, 2004. – 158 с.

*Михайлова, Л. И.* Социология культуры: учеб. пособие / Л. И. Михайлова. – М.: ФАИР-ПРЕСС, 1999. – 232 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Никитенко, П. Г.* Ноосферная экономика и социальная политика: стратегия инновационного развития / П. Г. Никитенко. – Минск: Белорус. наука, 2006. – 479 с.

*Переверзев, М. П.* Менеджмент в сфере культуры и искусства: учеб. пособие / М. П. Переверзев, Т. В. Косцов. – М.: ИНФРА-М, 2007. – 192 с.

*Саркисов, С. Э.* Менеджмент: словарь-справочник / С. Э. Саркисов. – М.: Анкил, 2005. – 808 с.

*Степанцов, А. И.* Кадры культуры как коллективный субъект социально-культурной деятельности / А. И. Степанцов // Арт-менеджмент как вид управленческой деятельности: сб. ст. / под. ред. С. Б. Мойсейчук, А. И. Степанцова. – Минск: Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2011. – С. 36–47.

*Стрельцов, Ю.А.* Культурология досуга: учеб. пособие / Ю.А.Стрельцов. – 2-е изд. – М.: МГУКИ, 2003. – 151 с.

*Тульчинский, Г. Л.* Менеджмент в сфере культуры: учеб. пособие / Г. Л. Тульчинский, Е. Л. Шекова. – 4-е изд. – СПб.: Лань: Планета музыки, 2009. – 544 с.

*Чижиков, В. М.* Введение в социокультурный менеджмент / В. М. Чижиков, В. В. Чижиков. – М.: МГУКИ, 2003. – 382 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-02*
*Культуралогія (прыкладная)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2012. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,98. Ул.-выд. арк. 0,60. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ